Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
універсітэт культуры і мастацтваў”
_____________ Ю.П.Бондар
“____” _____________ 2010 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___ /баз.

# ЭТНАГЕНЕЗ І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная),*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2010

**Складальнікі:**

*Л.К.Кухто,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі, дацэнт (раздзел 1);

*А.А.Спірына,* выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі (раздзел 3);

*Н.Я.Шалупенка,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі (раздзел 2)

**Рэцэнзенты:**

*У.Ф.Мартынаў,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава”, доктар культуралогіі, прафесар;

*В.В.Сашчэка,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 9 ад 26.05.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 7 ад 08.06.2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *І.В.Смяян*
Адказны за выпуск *Н.Я.Шалупенка*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Падрыхтоўка спецыяліста-культуролага ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі прадугледжвае авалоданне ведамі па пытаннях этнакультурнага развіцця беларускага грамадства, гісторыі айчыннай культуры, заканамернасцей і дынамікі яе гістарычнага развіцця.

Вучэбная дысцыпліна "Этнагенез і культура беларусаў" з'яўляецца важнай складаючай адукацыйнага культуралагічнага цыкла і накіравана на фарміраванне ў студэнтаў сістэмных ведаў і ўяўленняў аб этнагенезе і культурагенезе беларусаў, асаблівасцях менталітэту і самасвядомасці беларускага народа, развіцці нацыянальнай культуры і адметных рэгіянальных культур, гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі, механізмах міжкультурнай камунікацыі.

Курс распрацаваны з улікам тэарэтычных дасягненняў айчыннай культуралогіі, этналогіі, этнаграфіі, сумежных дысцыплін.

Выкладанне курса дазваляе выпрацаваць у студэнтаў аб'ектыўныя падыходы да ацэнкі з'яў беларускай культуры, дапамагае ў фарміраванні патрыятычных і грамадзянскіх якасцей, ідэалагічных установак студэнтаў.

Змест курса "Этнагенез і культура беларусаў" уключае наступныя раздзелы:

- "Этнакультуралогія";
- "Генезіс і дынаміка беларускай культуры";
- "Рэгіянальныя культуры Беларусі".

*Мэта* курса – фарміраванне сістэмы ведаў аб этнакультурным развіцці беларускага народа, самабытнасці і рэгіянальных асаблівасцях беларускай культуры.

*Задачы* курса:

– засваенне студэнтамі паняццяў і тэрміналогіі вывучаемай дысцыпліны;

– азнаямленне з асноўнымі канцэпцыямі этнагенезу беларусаў;

– фарміраванне ў студэнтаў уяўлення аб дынаміцы, тэндэнцыях і асаблівасцях развіцця беларускай культуры;

– пашырэнне ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне беларускага народа;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– азнаямленне з рэгіянальнымі і лакальнымі асаблівасцямі беларускай культуры;

– засваенне ведаў аб механізмах міжкультурнай камунікацыі.

У выніку вывучэння дадзенага курса студэнты павінны ведаць:

– асноўныя этапы развіцця беларускай культуры, іх асаблівасці;

– асноўныя канцэпцыі этнагенезу беларусаў;

– рэгіянальныя асаблівасці беларускай культуры;

– асноўныя дасягненні беларускай культуры.

Студэнты павінны *ўмець:*

– характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай культуры;

– вызначаць месца і ролю беларускай культуры ў агульнаеўрапейскай і сусветнай культурнай прасторы;

– аналізаваць канцэпцыі беларускага этнагенезу і развіцця беларускай культуры;

– характарызаваць асаблівасці дынамікі беларускай культуры;

– аналізаваць мінулае і сучаснае рэгіянальных і лакальных культур на тэрыторыі Беларусі;

– аналізаваць асноўныя прынцыпы і кірункі дзяржаўнай палітыкі РБ у галіне падтрымкі і адраджэння рэгіянальных культур;

– характарызаваць звычаі і традыцыі беларускага народа.

Вывучэнне курса ажыццяўляецца ў форме лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў. Значнае месца надаецца самастойнай рабоце студэнтаў, якая дазваляе набыць неабходныя навыкі самастойнага тэарэтычнага пошуку і творчасці.

Вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Этнагенез і культура беларусаў” прадугледжаны 362 гадзіны, з іх 172 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 76, практычныя – 10, семінары – 86.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практыч-ныя заняткі | семінары |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Уводзіны | 4 | 2 | | 2 |
| **Раздзел 1. Этнакультуралогія** | | | | |
| 1. Этнас і яго структура | 12 | 6 | | 6 |
| 2. Этнагенез і яго асноўныя фактары | 14 | 6 | | 8 |
| 3. Асноўныя канцэпцыі беларускага этнагенезу | 10 | 4 | | 6 |
| 4. Менталітэт і асаблівасці самасвядомасці беларусаў | 10 | 4 | | 6 |
| 5. Этнічная культура | 10 | 4 | | 6 |
| **Раздзел 2. Генезіс і дынаміка беларускай культуры** | | | | |
| 6. Генезіс і дынаміка культуры | 4 | 2 | | 2 |
| 7. Культурагенез беларусаў у перыяд фарміравання і развіцця ўсходнеславянскай супольнасці | 12 | 6 | | 6 |
| 8. Беларуская культура часоў Вялікага княства Літоўскага. Рэнесанс і Рэфармацыя (другая палова XIII – сярэдзіна XVI ст.) | 16 | 6 | | 10 |
| 9. Беларуская культура другой паловы XVI–XVIII ст. | 14 | 6 | | 8 |
| 10. Культура эпохі фарміравання беларускай нацыі (XIX ст.) | 14 | 6 | | 8 |
| **Раздзел 3. Рэгіянальныя культуры Беларусі** | | | | |
| 11. Рэгіянальныя культуры Беларусі: асноўныя паняцці | 4 | 2 | 2 | |
| 12. Агульная характарыстыка рэгіянальных культур Беларусі (Віцебскае Падзвінне, Магілёўскае Падняпроўе, Гомельскае і Брэсцкае Палессе, Гродзенскае Панямонне, Цэнтральная Беларусь (Міншчына)): мінулае і сучаснае | 6 | 4 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 13. Культура Віцебскага Падзвіння | 4 | 2 | | 2 |
| 14. Культура Магілёўскага Падняпроўя | 4 | 2 | | 2 |
| 15. Культура Гомельскага Палесся | 4 | 2 | | 2 |
| 16. Культура Брэсцкага Палесся | 4 | 2 | | 2 |
| 17. Культура Гродзенскага Панямоння | 4 | 2 | | 2 |
| 18. Культура Цэнтральнай Беларусі (Міншчыны) | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 19. Рэгіянальныя і лакальныя культуры Беларусі. Шлях да нацыянальнай культуры | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 20. Актуальныя праблемы развіцця рэгіянальных і лакальных культур ва ўмовах глабалізацыі | 4 | 2 | | 2 |
| 21. Дзяржаўная палітыка па падтрымцы беларускай нацыянальнай культуры і рэгіянальных культур Беларусі | 6 | 2 | 2 | 2 |
| **Усяго…** | **172** | **76** | **10** | **86** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

“Этнагенез і культура беларусаў” як навучальная дысцыпліна. Прадмет, мэты і задачы курса. Структура курса: этнакультуралогія, генезіс і дынаміка культуры, рэгіянальныя культуры Беларусі. Сувязь курса з іншымі навучальнымі дысцыплінамі.

Этнакультуралогія як галіна культуралогіі. Мэты і задачы этнакультуралогіі: выяўленне асноўных дэфініцый этнасу, генезіс і развіццё этнічнай культуры, міжэтнічныя адносіны. Метады этнакультуралогіі.

## Раздзел 1. Этнакультуралогія

### *Тэма 1. Этнас і яго структура*

Паняцці “этнас”, “этнічная супольнасць” і “этнічная група”. Гістарычныя формы існавання этнасу: племя, народ, нацыя. Прыкметы нацыі: самаідэнтыфікацыя, нацыянальная самасвядомасць, каштоўнасныя і культурныя арыентацыі, мова, прафесійная культура, устойлівы сацыяльна-класавы састаў.

Асноўныя дэфініцыі этнасу: гісторыка-культурная дэфініцыя Ю.В.Брамлея, інфармацыйная тэорыя этнасу М.М.Чэбаксарава і С.А.Аруцюнава, адаптыўна-дзейнасныя дэфініцыі этнасу, аксіялагічныя дэфініцыі этнасу. Фактары фарміравання этнасу.

Асноўныя прыкметы этнасу: адзінства міфалагічных і рэлігійных вераванняў, звычаі і традыцыі (святы, абрады, тыповыя мадэлі паводзін, правядзенне вольнага часу), мова, этнічны стэрэатып (аўтастэрэатыпы і гетэрастэрэатыпы) і этнічны вобраз. Этнічны вобраз як элемент этнічнай свядомасці, этнічнае саманазванне (этнонім). Этнічныя каштоўнасці як значымая частка свядомасці этнасу. Ідэалы, жыццёвыя арыенціры, абрады і асаблівасці этыкету, асобныя рысы народнай культуры – каштоўнасці, якія фарміруюцца на ранніх этапах развіцця этнасу. Функцыі этнічных каштоўнасцей: інтэгратыўная, нарматыўна-рэгулятыўная, ідэалагічная, адаптыўная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вертыкальная структура этнасу, яе асноўныя ўзроўні (уласны этнічны, мікраўзровень, макраўзровень, метаўзровень). Гарызантальная структура этнасу. Праяўленне розных сацыяльна-класавых інтарэсаў праз адзіныя этнічныя канстанты.

### *Тэма 2. Этнагенез і яго асноўныя фактары*

Паняцце этнагенезу. Аб'ектыўныя (тэрытарыяльныя, эканамічныя, палітычныя, сацыякультурныя) і суб'ектыўныя фактары этнагенезу. Этнічныя працэсы як магчымасць змянення асобых элементаў духоўнай і матэрыяльнай культуры, мовы, сацыяльнай структуры, самасвядомасці. Тыпы этнагенетычных працэсаў. Асноўныя формы этнічнага аб'яднання і раздзялення – этнічная фузія, этнічная кансалідацыя, этнічная асіміляцыя, міжэтнічная інтэграцыя, этнагенетычная міксацыя, этнічная парцыяцыя, этнічная сепарацыя. Этнатрансфармацыйныя і этнаэвалюцыйныя працэсы. Тытульныя народы і этнічная меншасць. Канцэпцыя этнагенезу Л.М.Гумілёва.

Беларускі этнагенез. Праблема паходжання беларусаў: роля балта-славянскага субстрату. Асноўныя фактары этнагенезу беларусаў. Роля канфесіянальнага фактару ў этнагенезе беларускага народа. Дынаміка этнічных працэсаў. Этнасацыяльныя працэсы ў XIV – першай палове XVII ст. Этнаўтваральныя фактары працэсу фарміравання народнасці. Этнаэвалюцыйны характар інтэграцыйных і кансалідацыйных працэсаў у XVII–XVIII стст. Фарміраванне і развіццё беларускай нацыі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускага этнасу ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Поліфункцыянальнасць фактараў этнічнага развіцця. Беларуская нацыя на сучасным этапе. Этнічныя працэсы ў сучаснай Беларусі.

### *Тэма 3. Асноўныя канцэпцыі беларускага этнагенезу*

Вывучэнне этнагенезу беларусаў XV–XVIII стст. Абгрунтаванне тэорыі агульнай (дунайскай, панонскай, карпацкай) прарадзімы славян. Моўная блізкасць славянскіх народаў як галоўны доказ агульнага этнічнага вытоку.

Праблемы паходжання беларусаў у канцы XVIII – першай палове XIXст. Размеркаванне славянскага насельніцтва па канфесіянальнай прыкмеце (С.Пляшчэеў). Класіфікацыя на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельніцтва па моўных, этнагенетычных і канфесіянальных прыкметах В.Тацішчава. Даследаванні І.Грыгаровіча, Ф.Булгарына, П.Шафарыка, П.Шпілеўскага.

Этнагенетычныя даследаванні ў канцы XIX – пачатку XX ст. Погляды на этнагенез і этнічную гісторыю беларусаў Ф.Буслаева, М.Каяловіча. Крывічская тэорыя В.Ластоўскага. Выяўленне элементаў этнічнага адзінства і мясцовых асаблівасцей ва ўсходніх славян А.Спіцыным. Этнагенетычная канцэпцыя Я.Карскага.

Даследаванне праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў у савецкі перыяд. Вызначэнне галоўных цэнтраў беларускай народнасці А.Анучыным. Пазіцыі паходжання беларускага народа ў працах У.Пічэты. Балцкая тэорыя В.В.Сядова.

Асноўныя аспекты даследавання праблемы паходжання беларусаў на сучасным этапе. Роля сацыяльна-эканамічных фактараў у працэсе фарміравання і этнічнага развіцця народаў. Вызначэнне вытокаў і прычын асаблівасцей культуры, мовы, самасвядомасці беларусаў. Комплексны падыход да вырашэння праблемы этнагенезу.

## *Тэма 4. Менталітэт і асаблівасці самасвядомасці беларусаў*

Паняцці менталітэту, ментальнасці і народнага характару. Асноўныя падыходы да вывучэння (С.Ф.Дубянецкі, Э.С.Дубянецкі, Ю.В.Чарняўская і інш.). Менталітэт як сацыякультурнае ядро самасвядомасці. Фарміраванне беларускага менталітэту: асноўныя фактары. Этнічныя каштоўнасці і характэрныя рысы беларускага менталітэту.

Этнічная і нацыянальная свядомасць: агульнае і асаблівае. Фактары фарміравання нацыянальнай самасвядомасці: радавы, псіхалагічны, культурны і інш. Структура і ўзроўні нацыянальнай самасвядомасці. Патрыятызм і нацыяналізм як спосабы праяўлення нацыянальнай самасвядомасці.

Сутнасць этнічнай ідэнтычнасці. Характарыстыка асноў этнічнай ідэнтычнасці: параджальныя механізмы, прыкметы супольнасці, сродкі і ўмовы рэалізацыі этнічнай ідэнтычнасці. Этнадыферэнцуючыя прыкметы этнічнай ідэнтычнасці (мова, рэлігія, культурна-гаспадарчыя асаблівасці, абрады, звычаі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Этнічная культура*

Культура і яе этнічныя функцыі (інструментальная, інкультурацыі, нарматыўная, знакавая, пазнавальная, камунікатыўная). Этнічная культура як сукупнасць этнадыферэнцыруючых і этнаінтэгрыруючых характарыстык культуры. Праяўленне этнічнай культуры ў мове, асаблівасцях выхавання, адзенні, уладкаванні жылля, у вядзенні хатняй гаспадаркі, у фальклоры. Уплыў на фарміраванне этнічнай культуры прыродных умоў, рэлігіі, псіхічнага складу этнасу. Асаблівасці фарміравання этнічнай культуры беларусаў.

Узроўні этнічнай культуры. Традыцыйна-бытавая і прафесійная культура. Сімвал і міф як састаўныя элементы этнічнай культуры. Этнонімы як важнейшы элемент этнічнай культуры. Нацыянальная культура.

Суадносіны агульначалавечай, этнанацыянальнай і рэгіянальнай культуры. Экафільныя і экацыдныя тыпы культуры. Аксіялагічны падыход як уяўленне аб сусветнай культуры як цэласнасці, якая знаходзіцца ў працэсе гістарычнага развіцця.

## **Раздзел 2. Генезіс і дынаміка беларускай культуры**

### *Тэма 6. Генезіс і дынаміка культуры*

Культура як сукупны духоўны вопыт народа. Паняцці генезісу і дынамікі культуры. Каштоўнасці і дынаміка культуры. Традыцыі і навацыі як механізмы культурнай дынамікі. Унутраныя і знешнія фактары культурных змяненняў. Роля міжкультурных узаемадзеянняў у дынаміцы культуры. Праблемы развіцця беларускай культуры.

### *Тэма 7. Культурагенез беларусаў у перыяд фарміравання і развіцця ўсходнеславянскай супольнасці*

Асноўныя крыніцы даследавання беларускай культуры эпохі культурагенезу. Першабытнасць на тэрыторыі Беларусі. Геаграфічныя і антраполага-этнаграфічныя характарыстыкі прыроды і насельніцтва. Балта-славянскае ўзаемадзеянне. Беларускія землі ў складзе Кіеўскай Русі. Фактары развіцця ўсходнеславянскай супольнасці. Язычніцкія вераванні ва ўсходніх славян. Прыняцце хрысціянства – пераломная з’ява

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў культуры ўсходніх славян. Спалучэнне хрысціянскіх і язычніцкіх тэндэнцый у культуры Кіеўскай Русі.

Пісьменнасць, кніжнасць і адукацыя ў Кіеўскай Русі. Помнікі старажытнай пісьменнасці. Старажытныя евангеллі: Тураўскае, Полацкае, Аршанскае. Летапісанне: Полацкі, Смаленскі і іншыя летапісы. “Слова аб палку Ігаравым” як агульны помнік культуры ўсходніх славян. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы і іх уклад у культуру: К.Смаляціч, К.Тураўскі, Е.Полацкая і інш.

Гарады як адміністрацыйна-палітычныя, эканамічныя, рэлігійныя і культурныя цэнтры. Архітэктура беларускіх гарадоў. Агульныя рысы манументальнага дойлідства. Архітэктура хрысціянскага храма, рысы раманска-візантыйскага стылю. Полацкая школа дойлідства: Сафійскі сабор, Барысаглебская царква ў Бельчыцах, Спаса-Ефрасіннеўская царква. Адхіленне ад візантыйскіх стандартаў, пошукі мясцовых архітэктурных формаў у полацкіх храмах. Гродзенская школа дойлідства: Барысаглебская царква і яе унікальнасць. Храмы Смаленска, Віцебска, Навагрудка. Манументальны жывапіс (фрэскі) у храмах.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: керамічныя і ювелірныя вырабы, мастацкае ліццё, апрацоўка дрэва, кавальская справа. Лазар Богша і крыж Е.Полацкай – вышэйшае дасягненне прыкладнога мастацтва.

### *Тэма 8. Беларуская культура часоў Вялікага княства Літоўскага. Рэнесанс і Рэфармацыя (другая палова XIII – сярэдзіна XVI ст.)*

Утварэнне ВКЛ. Поліэтнічны і шматканфесіянальны характар ВКЛ. Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Роля старажытнабеларускай мовы і яе статус у ВКЛ. Фарміраванне прававой сістэмы. Магдэбургскае права. Рост гарадоў і развіццё рамёстваў.

Фарміраванне культуры асноўных сацыяльных груп насельніцтва: сельскага, гараджан, шляхты. Роля шляхты ў развіцці духоўнай культуры.

Рэнесансныя ідэі ў Беларусі: умовы і фактары ўзнікнення. Агульнаеўрапейскія і спецыфічныя рысы беларускага Рэнесанса. Рэфармацыя і яе асаблівасці. Рэфармацыя і беларускае Адраджэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станаўленне і развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці: друкарні ў Брэсце, Нясвіжы і інш. Ф.Скарына і яго роля ў беларускім Адраджэнні. Свецкая і царкоўная літаратура. Росквіт летапісання ў ВКЛ. Беларускія летапісы як гістарычныя і літаратурна-мастацкія помнікі. Рэнесансныя традыцыі беларускіх летапісаў. Паэты-лацiністы: М.Гусоўскі, Я.Вісліцкі. Узнікненне новых жанраў літаратуры. Сатырычныя творы. Палемічная літаратура.

Прававая і грамадска-палітычная думка і яе ўплыў на культурнае жыццё. Статуты ВКЛ. Статут трэцяй рэдакцыі як помнік рэнесанснай культуры. Рэфармацыйна-гуманістычныя ідэі С.Буднага, В.Цяпінскага, Л.Сапегі.

Адукацыя і асвета ў ВКЛ. Праваслаўныя брацтвы. Віленская езуіцкая акадэмія. Вучоба беларусаў ва універсітэтах Еўропы (Польшча, Германія, Англія і інш.).

Архітэктура. Асноўныя архітэктурныя стылі: раманскі, беларуская готыка. Абарончы характар замкаў. Спалучэнне ў іх архітэктуры раманскіх і гатычных асаблівасцей. Замкавыя комплексы ў Лідзе, Навагрудку, Крэве, Гродне, Міры. Культавая архітэктура. Рэнесансны стыль архітэктуры.

Выяўленчае мастацтва, беларуская школа іканапісу. Сувязь беларускай іконы з візантыйскай іканапіснай традыцыяй, заходнееўрапейскімі іканапіснымі прынцыпамі, эстэтыкай народнага мастацтва. Развіццё свецкага партрэта сармацкага тыпу – з’ява Рэнесанса. Развіццё мініяцюры і кніжнай графікі. Скульптура. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Школьны тэатр і тэатр лялек. Станаўленне прафесійнай музычнай культуры.

### *Тэма 9. Беларуская культура другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст.*

Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры. Распаўсюджанне каталіцызму і працэс паланізацыі ва ўмовах Рэчы Паспалітай. Рух Контррэфармацыі. Езуіты і іх роля ў жыцці грамадства. Канфесіянальная сітуацыя. Царкоўная унія як вырашэнне супрацьстаяння каталіцызму і праваслаўя. Уніяцкая царква і беларуская мова ў ёй. Выцясненне беларускай мовы з дзяржаўнага ўжытку. Дэнацыяналізацыя беларускай шляхты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адукацыя і асвета. Развіццё школ каталіцкіх ордэнаў. Станаўленне навукі. Стварэнне Адукацыйнай камісіі і развіццё свецкага навучання як з'ява Асветніцтва. Асветніцкая дзейнасць І.Храптовіча, М.Пачобута-Адляніцкага.

Развіццё барока ў розных відах мастацкай творчасці. Літаратура барока: высокае і нізкае. С.Полацкі і барочныя асаблівасці яго паэзіі. Рэлігійная палеміка ў літаратуры (М.Смартыцкі). Сатырычныя творы як узоры нізкага барока ў Беларусі.

Стыль барока ў архітэктуры. Культавая архітэктура. Касцёлы: Мінск, Нясвіж. Віленскае барока. Палацава-замкавае будаўніцтва. Асаблівасці гарадскога будаўніцтва.

Развіццё беларускай школы іканапісу. Росквіт жанру свецкага партрэта, яго барочныя асаблівасці. Беларуская графіка. Творчасць братоў Тарасевічаў, свецкія сюжэты і партрэтныя работы. М. Вашчанка – выдавец і графік.

Станаўленне барочнай скульптуры. Дзейнасць беларускіх майстроў у Маскве. Дэкаратыўная разьба. Мануфактурная вытворчасць. Слуцкія паясы, іх папулярнасць за межамі Беларусі.

Музычнае жыццё. Аркестры і капэлы. Развіццё школьнага тэатра, батлейкі. Магнацкія тэатры Радзівілаў, Сапегаў. Дзейнасць музычна-тэатральных школ. Сінтэз рэнесансных, барочных і класічных тэндэнцый у музыцы і тэатры.

Грамадская думка эпохі Асветніцтва. Ідэі К.Лышчынскага, С.Маймана. Дзейнасць І.Капіевіча, К.Нарбута.

### *Тэма 10. Культура эпохі фарміравання беларускай нацыі (XIX ст.)*

Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Змены ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх зямель і іх уплыў на культурнае жыццё. Канфесіянальная і нацыянальная палітыка. Ідэалогія "заходнерусізму". Ліквідацыя уніяцтва. Русіфікацыя і забарона беларускай мовы.

Фарміраванне беларускай нацыі. Саслоўны і канфесіянальны склад насельніцтва Беларусі. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў.

Адукацыя і асвета. Школьная рэформа. Тыпы школ. Школа як інструмент русіфікацыі. Вышэйшая адукацыя: Віленскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

універсітэт, Полацкая езуіцкая акадэмія, Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Развіццё сеткі настаўніцкіх семінарый.

Развіццё беларусазнаўства. Вывучэнне гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Дзейнасць І.Грыгаровіча, братоў Тышкевічаў, М.Без-Карніловіча. Стварэнне Віленскага музея старажытнасцей, Віленскай археалагічнай камісіі. Развіццё ў 2-й палове XIX ст. беларускай фалькларыстыкі, этнаграфіі, моваўнаўства (П.Шпілеўскі, І.Насовіч, М.Нікіфароўскі, П.Шэйн, М.Федароўскі, Э.Пякарскі).

Літаратурны рух, яго сувязь з ідэалогіяй Асветніцтва. Паэты-філаматы: Я.Чачот, А.Міцкевіч, Т.Зан. Ананімная літаратура на беларускай мове. Беларускія матывы ў творчасці А.Міцкевіча. Польская літаратура Беларусі як з'ява беларускай культуры XIX ст.: Я.Баршчэўскі, В.Дунін-Марцінкевіч. Станаўленне беларускіх нацыянальных тэндэнцый у літаратуры. Творчасць Ф.Багушэвіча. Станаўленне беларускай драматургіі. В.Дунін-Марцінкевіч і яго творы.

Вядучыя кірункі выяўленчага мастацтва: класіцызм, рамантызм, рэалізм. Інтэнсіўнае развіццё жывапісу, яго свецкі характар. Класіцызм у беларускім жывапісе. Сувязь рамантызму і рэалізму як фактар развіцця жывапісу Беларусі ў XIX ст. Віленская школа жывапісу. Асноўныя жанры: партрэт (І.Аляшкевіч, В.Ваньковіч, Я.Дамель, І.Хруцкі і інш.), пейзаж (В.Дмахоўскі, А.Гараўскі, Ф.Рушчыц і інш.), гістарычны (Ф.Смуглевіч, Я.Сухадольскі, Я.Дамель, К.Альхімовіч), бытавы (К.Кукевіч, Т.Гарэцкі). Архітэктурна-гістарычныя і этнаграфічныя кампазіцыі Н.Орды як летапіс замкаў і сядзіб Беларусі.

Скульптура. Творчасць К.Ельскага, Р.Слізеня, Я.Астроўскага.

Станаўленне класіцызму ў архітэктуры. Планіроўка гарадоў, фарміраванне гарадскіх ансамбляў, адміністрацыйныя будынкі. Палацава-сядзібная архітэктура. Адыход ад класіцызму і развіццё эклектыкі. Псеўдарускі стыль архітэктуры.

Развіццё народнай лірычнай песні і народнай інструментальнай музыкі. Творчасць беларускіх кампазітараў: М.-К.Агінскі, А.Абрамовіч, М.Ельскі, Ф.Міладоўскі. Станаўленне опернага мастацтва. С.Манюшка ў гісторыі беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел 3. Рэгіянальныя культуры Беларусі

## *Тэма 11. Рэгіянальныя культуры Беларусі: асноўныя паняцці*

Месца і роля рэгіянальных культур у тэрытарыяльнай тыпалогіі культуры. Крытэрый тэрыторыі (арэала). Мультырэгіянальныя, нацыянальныя, этнічныя, рэгіянальныя і лакальныя культуры: агульнае і адметнае.

Канцэпт рэгіёна. Наяўнасць прыродных тэрытарыяльных комплексаў у межах фізіка-геаграфічных правінцый і гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне матэрыяльнай і духоўнай культуры як падстава для вылучэння рэгіянальных культур на тэрыторыі Беларусі. Межы культурных рэгіёнаў і сучаснае адміністрацыйнае дзяленне РБ. Лакальныя культурныя раёны і падраёны на тэрыторыі РБ.

## *Тэма 12. Агульная характарыстыка рэгіянальных культур Беларусі (Віцебскае Падзвінне, Магілёўскае Падняпроўе, Гомельскае і Брэсцкае Палессе, Гродзенскае Панямонне, Цэнтральная Беларусь (Міншчына): мінулае і сучаснае*

Пяць асноўных этнічных ядзер на тэрыторыі сярэднявечнай Беларусі (У.Пічэта). Тры буйныя гісторыка-культурныя вобласці (Літва, або Чорная Русь; Белая Русь і Палессе). Шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў на тэрыторыі Беларусі (Падзвінне (Паазер'е), Падняпроўе, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь), XVIII–XIX стст. Спецыфіка культуралагічнага падыходу да навуковага аналізу этнакультурных прыкмет рэгіёна. Сучасныя культурныя рэгіёны на тэрыторыі Беларусі: Віцебскае Падзвінне (Паазер'е), Магілёўскае Падняпроўе, Гомельскае Палессе, Брэсцкае Палессе, Гродзенскае Панямонне, Цэнтральная Беларусь (Міншчына). Паняцце субрэгіёна. Этнакультурныя комплексы на памежжы культурных рэгіёнаў. Спецыфіка памежных культурных зон (Гомельска-Бранска-Чарнігаўскі субрэгіён і інш.).

## *Тэма 13. Культура Віцебскага Падзвіння*

Прыродныя ўмовы рэгіёна. Духоўная і матэрыяльная культура рэгіёна. Асаблівасці рэгіянальнай гісторыі. Полаччына як "калыска беларускай дзяржаўнасці". Стварэнне унікальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокаразвітой культуры на тэрыторыі рэгіёна. Этнаканфесіянальныя адносіны ў рэгіёне. Асаблівасці традыцыйнай народнай культуры: жыллё, адзенне і інш. Вуснапаэтычная творчасць. Музычная культура рэгіёна. Праблема захавання традыцыйнай спадчыны, традыцыі і навацыі ў рэгіёне, адраджэнне традыцыйных промыслаў. Наяўнасць лакальных культур на тэрыторыі рэгіёна, іх спецыфіка. Развіццё сацыякультурнай сферы. Сучасная дэмаграфічная сітуацыя. Перспектывы развіцця рэгіёна. Сучасныя культурныя праекты.

### *Тэма 14. Культура Магілёўскага Падняпроўя*

Прыродныя ўмовы рэгіёна. Духоўная і матэрыяльная культура рэгіёна. Асаблівасці рэгіянальнай гісторыі. Развітое пачуццё калектывізму і наяўнасць удалых калектыўных практык як характэрная рыса рэгіёна. Этнаканфесіянальныя адносіны ў рэгіёне. Асаблівасці традыцыйнай народнай культуры: жыллё, адзенне, промыслы і рамёствы. Вуснапаэтычная творчасць. Музычная культура рэгіёна. Праблема захавання традыцыйнай культуры ў рэгіёне. Наяўнасць лакальных культур на тэрыторыі рэгіёна, іх спецыфіка. Развіццё сацыякультурнай сферы. Сучасная дэмаграфічная сітуацыя. Перспектывы развіцця рэгіёна. Сучасныя культурныя праекты.

### *Тэма 15. Культура Гомельскага Палесся*

Прыродныя ўмовы рэгіёна. Духоўная і матэрыяльная культура рэгіёна. Асаблівасці рэгіянальнай гісторыі. Захаванне традыцыйнай культурнай спадчыны як адметная рыса рэгіёна. Архаічныя рэшткі ў сучаснай культуры Гомельскага Палесся. Асаблівасць сацыякультурнай сітуацыі пасля аварыі на ЧАЭС. Этнаканфесіянальныя адносіны ў рэгіёне. Асаблівасці традыцыйнай народнай культуры: жыллё, адзенне, промыслы і рамёствы. Вуснапаэтычная творчасць. Музычная культура рэгіёна. Праблема захавання традыцыйнай культуры ў рэгіёне. Гісторыка-культурная спадчына рэгіёна. Наяўнасць лакальных культур на тэрыторыі рэгіёна, іх спецыфіка (Турава-Мазырскае Палессе і інш.). Развіццё сацыякультурнай сферы. Перспектывы развіцця рэгіёна. Сучасныя культурныя праекты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 16. Культура Брэсцкага Палесся*

Прыродныя ўмовы рэгіёна. Духоўная і матэрыяльная культура рэгіёна. Асаблівасці рэгіянальнай гісторыі. Этнаканфесіянальныя адносіны ў рэгіёне. Стракатасць этнаканфесіянальнай сітуацыі як адметнасць культуры рэгіёна. Асаблівасці традыцыйнай народнай культуры: жыллё, адзенне, промыслы і рамёствы. Вуснапаэтычная творчасць. Музычная культура рэгіёна. Праблема захавання традыцыйнай культуры ў рэгіёне. Гісторыка-культурная спадчына рэгіёна. Наяўнасць лакальных культур на тэрыторыі рэгіёна, іх спецыфіка. Развіццё сацыякультурнай сферы. Перспектывы развіцця рэгіёна. Сучасныя культурныя праекты.

### *Тэма 17. Культура Гродзенскага Панямоння*

Прыродныя ўмовы рэгіёна. Духоўная і матэрыяльная культура рэгіёна. Асаблівасці рэгіянальнай гісторыі. Этнаканфесіянальныя адносіны ў рэгіёне. Высокая культура этнаканфесіянальных адносін у рэгіёне як адметная рыса Панямоння. Асаблівасці традыцыйнай народнай культуры: жыллё, адзенне, промыслы і рамёствы. Вуснапаэтычная творчасць. Музычная культура рэгіёна. Праблема захавання традыцыйнай культуры ў рэгіёне. Гісторыка-культурная спадчына рэгіёна. Наяўнасць лакальных культур на тэрыторыі рэгіёна, іх спецыфіка. Развіццё сацыякультурнай сферы. Сучасныя культурныя праекты.

### *Тэма 18. Культура Цэнтральнай Беларусі (Міншчыны)*

Прыродныя ўмовы рэгіёна. Духоўная і матэрыяльная культура рэгіёна. Сінтэз розных культурных традыцый як характэрная прыкмета рэгіёна. Асаблівасці рэгіянальнай гісторыі. Станаўленне і развіццё Мінска як адміністрацыйнага, культурнага, навуковага, прамысловага цэнтра. Этнаканфесіянальныя адносіны ў рэгіёне. Асаблівасці традыцыйнай народнай культуры: жыллё, адзенне, промыслы і рамёствы. Вуснапаэтычная творчасць. Музычная культура рэгіёна. Гісторыка-культурная спадчына рэгіёна. Наяўнасць лакальных культур на тэрыторыі рэгіёна, іх спецыфіка. Развіццё сацыякультурнай сферы. Перспектывы развіцця рэгіёна. Сучасныя культурныя праекты (Нацыянальная бібліятэка Беларусі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 19. Рэгіянальныя і лакальныя культуры Беларусі. Шлях да нацыянальнай культуры*

Палітызаваныя ідэалогіі XX ст. Станаўленне беларускай нацыянальнай ідэі як навуковая праблема. Сучасная ідэалогія Беларускай дзяржавы (Я.Бабосаў і інш.): агульны агляд. Нацыянальныя культуры сучаснасці ў святле геапалітычных і культурных працэсаў. Праблема захавання культурнай самабытнасці.

Дынаміка і асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай нацыянальнай культуры: дыяхронны і сінхронны аспекты. Беларуская культура як шматмоўны, поліэтнічны і паліканфесіянальны феномен. Месца і роля беларускай культуры ў агульнаеўрапейскай і сусветнай культурнай прасторы. Жыццё і творчасць выдатных дзеячаў культуры, навукі, мастацтва Беларусі і свету (Ф.Скарына, І.Дамейка, М.Шагал і інш.).

### *Тэма 20. Актуальныя праблемы развіцця рэгіянальных і лакальных культур ва ўмовах глабалізацыі*

Глабалізацыя культуры як гістарычны працэс і культурная з'ява сучаснасці. Працэс “глакалізацыі культуры”. Сусветная тэндэнцыя “вяртання да вытокаў”. Праблема антыглабалізму, нацыяналізму і рэгіяналізму ў сучасным свеце.

Гістарычная, этнаканфесіянальная і моўная спецыфіка лакальных культур на тэрыторыі Беларусі: асноўныя вынікі. Перспектывы развіцця рэгіянальных і лакальных культур Беларусі. Праблема цэнтра і перыферыі ў сучаснай культуралагічнай думцы. Фарміраванне культурнага цэнтра Беларусі як навуковая праблема.

### *Тэма 21. Дзяржаўная палітыка па падтрымцы беларускай нацыянальнай культуры і рэгіянальных культур Беларусі*

Прынцыпы і асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі РБ у галіне адраджэння нацыянальнай культуры і рэгіянальных культур Беларусі: Канстытуцыя Беларусі (1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі 1996 г.), законы РБ “Аб культуры”, “Аб мовах”, “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”. Асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі (2006–2010 гг.). Нацыянальны план тэрытарыяльнага развіцця РБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Алексеев, В.П.* Историческая антропология и этногенез / В.П.Алексеев. – М.: Наука, 1989. – 245 с.

*2. Аляксееў, А.* Спадчына Беларусі = Heritage of Belarus / А.Аляксееў, А.Лукашэвіч. – Мн.: Мін. ф-ка каляр. друку, 2004. – 318 с., іл.

*3. Арутюнов, С.А.* Народы и культуры: развитие и взаимодействие / С.А.Арутюнов. – М.: Наука, 1989. – 247 с.

*4. Беларусы:* Вытокі і этнічнае развіццё / В.К.Бандарчык, В.М.Бялявіна, Г.І.Каспяровіч і інш.; НАНБ. Ін-т мастацтва-знаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 433 с.

*5. Воинов, А. А.* История архитектуры Белоруссии: в 2 т. / А.А.Воинов. – Мн.: Вышэйш. шк., 1987. – 294 с.

*6. Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускай літаратуры / М.Гарэцкі. – Мн.: Маст. літ., 1992. – 479 с.

*7. Гісторыя* Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 396 с.

*8. Гісторыя* беларускай культуры: дапаможнік / Гродзен. дзярж. ун-т імя Я.Купалы; склад.: С.А.Габрусевіч [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2004. – 58 с.

*9. Емельянов, Ю.Н.* Основы культурной антропологии / Ю.Н.Емельянов. – СПб.: Университет, 1994. – 97 с.

*10. Игнатович, П.Г.* Этнические основания культуры / П.Г.Игнатович, Ю.В.Чернявская. – Мн.: Технопринт, 2001. – 100 с.

*11. Качаноўскі, У.У.* Гісторыя культуры Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / У.У.Качаноўскі. – Мн.: Экаперс-пектыва, 1994. – 162 с.

*12. Кочетков, В.В.* Психология межкультурных различий / В.В.Кочетков. – Саратов: Саратов. гос. техн. ун-т, 1998. – 268 с.

*13. Культурология:* учеб. пособие / З.А.Неверова [и др.]; под науч. ред. А.С.Неверова. – Мн.: Вышэйш. шк., 2004. – 367 с.

*14. Локотко, А.И.* Историко-культурные регионы Беларуси / А.И.Локотко. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 223 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*15. Лурье, С.В.* Историческая этнология / С.В.Лурье. – М.: Академический проект, 1997. – 624 с.

*16. Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л.Лыч, У.Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

*17. Маликова, Н.Г.* Парадоксы межнационального мышления / Н.Г.Маликова. – М.: Ин-т социологии, 1992. – 298 с.

*18. Народы* и религии мира: энциклопедия / гл. ред. В.А.Тишков. – М.: Большая Российская энциклопедия, 1998. – 928 с.

*19. Парашкоў, С.* Гісторыя культуры Беларусі / С.Парашкоў. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 442, [2] с.

*20. Рэспубліка* Беларусь: вобласці і раёны: энцыкл. даведнік / аўт.-склад. Л.В.Календа. – Мн.: БелЭН, 2004. – 568 с., іл.

*21. Самусік, А.Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэб. дапам. / А.Ф.Самусік. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

*22. Солонин, Ю.Н.* Культурология: учебник / под ред. Ю.Н.Солонина, М.С.Кагана. – М.: Высш. образование, 2005. – 566 с.

*23. Цітоў, В.С.* Этнаграфічная спадчына: Беларусь: краіна і людзі / В.С.Цітоў. – 2-е выд. – Мн.: Беларусь, 2001. – 208 с.

*24. Чантурия, В.А.* Атлас памятников архитектуры и мемориальных комплексов Белорусии / В.А.Чантурия. – Мн.: Вышэйш. шк., 1983. – 110 с., ил.

*25. Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.1. А.Беліца / рэдкал.: М.В.Біч, А.П.Грыцкевіч, М.І.Ермаловіч [і інш.]. – Мн.: БелСЭ, 1993. – 494 с.

*26. Этнаграфія* Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал.: І.П.Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с., іл.

*Дадатковая*

*1. Адзіночанка, В.Р.* Рэлігіязнаўства: вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / В.Р.Адзіночанка. – Мн.: Універсітэцкае, 2003. – 239 с.

*2. Байбурин, А.К.* Ритуал в традиционной культуре / А.К.Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 347 с.

*3. Беларускія* летапісы і хронікі / уклад. І.Арлова. – Мн.: Бел. кнігазбор, 1997. – 430с.

*4. Беларусазнаўства:* вучэб. дапам. / БДУ; П.Брыгадзін, П.Лойка, Э.Дубянецкі [і інш.]; пад рэд. П.Брыгадзіна. – Мн.: Завігар, 1997. – 284 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5. Беларусь* шматнацыянальная: буклет-даведнік / аўтар тэксту і склад. Л.Міхальчук. – Мн.: Рыфтур, 2005. – 48 с., іл.

*6. Белорусы* / РАН, Ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н.Миклухо-Маклая; НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К.Крапивы; отв. ред. В.К.Бондарчик [и др.]. – М.: Наука, 1998. – 502, [1]с.

*7. Бромлей, Ю.В.* Очерки теории этноса / Ю.В.Бромлей // АН СССР, Институт этнографии им. Н.Н.Миклухо-Маклая. – М.: Наука, 1983. – 420 с.

*8. Высоцкая, Н.Ф.* Іканапіс Беларусі XV–XVIII стст. / Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 2001. – 230 с., іл.

*9. Геллнер, Э.* Нации и национализм / Э.Геллнер; ред. и послесл. И.И.Крупнина. – М.: Прогресс, 1991. – 320 с.

*10. Герман, М.Ю.* Парижская школа / М.Ю.Герман. – М.: Слово, 2003. – 268, [1] с.

*11. Гісторыя* Беларусі: вучэб. дапам. / пад рэд. А.Г.Каханоўскага. – Мн.: Экономпресс, 1997. – 298 с.

*12. Гісторыя* беларускай літаратуры. Старажытны перыяд: падручнік для філал. фак. пед. ін-таў студэнтаў / М.М.Грынчык, І.Н.Калеснік, У.Г.Кароткі [і інш.]. – Мн.: Вышэйш. шк., 1998. – 343 с.

*13. Грамадскі* быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 416 с.

*14. Гумилев, Л.Н.* Этногенез и биосфера Земли / Л.Н.Гумилев. – М.: Мишель и К, 1991. – 499 с.

*15. Дучыц, Л.У.* Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў / Л.У.Дучыц. – Мн.: Ураджай, 1993. – 212 с.

*16. Жывапіс* Беларусі XII–XVIII стст. – Мн.: Беларусь, 1989. – 220 с., іл.

*17. Кавалёў, С.* Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесанса / С.Кавалёў. – Мн.: БДУ, 2002. – 216 с.

*18. Карскі, Я.* Беларусы / Я.Карскі. – Мн.: Бел. кнігазбор, 2001. – 637 с.

*19. Кулагін, А.М.* Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыкл. даведнік / А.М.Кулагін. – Мн.: БелЭН, 2000. – 216 с.

*20. Кулагін, А.М.* Праваслаўныя храмы на Беларусі: энцыклапедычны даведнік / А.М.Кулагін. – Мн.: БелЭН, 2001. – 328 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. *Кушнярэвіч, А.М.* Культавае дойлідства Беларусі XII–XVI стст. / А.М.Кушнярэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 149 с.

22. *Лабынцаў, Ю.* Пачатае Скарынам. Беларуская друкаваная літаратура эпохі Рэнесанса / Ю.Лабынцаў. – Мн.: Маст. літ., 1990. – 333 с.

23. *Лазука, Б.* Беларускае барока. Гісторыка-тэарэтычныя праблемы стылю / Б.Лазука. – Мн.: Беларусь, 2000. – 143 с.

24. *Лакотка, А.* Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры / А.Лакотка. – Мн.: Ураджай, 1999. – 364, [2] с.

25. *Легенды* і паданні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. М.Я.Грынблат, А.І.Гурскі; рэд. А.С.Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 534 с.

26. *Ляонава, А.* Старажытнабеларуская скульптура / А.Ляонава. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 260 с.

27. *Мальдзіс, А.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва, культуры / А.Мальдзіс. – Мн.: Народная асвета, 1969. – 204 с.

28. *Нікалаеў, М.* Палата кнігапісная. Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стст. / М.Нікалаеў. – Мн.: Маст. літ., 1993. – 239 с.

29. *Няфёд, У.І.* Гісторыя беларускага тэатра : вучэб. дапам. для студэнтаў тэатр.-маст. ін-та / У.І.Няфёд. – Мн.: Вышэйш. шк., 1982. – 543 с.

30. *Очерки* истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / П.Т.Петриков, Д.В.Карев, А.А.Гусак [и др.]; АН Беларуси, Ин-т истории. – Мн.: Навука і тэхніка, 1996. – 527 с.

31. *Парашкоў, С.* Культура старажытнай Беларусі: ад засялення да сярэдзіны XIII ст. / С.Парашкоў. – Магілёў: МДУ імя А.Куляшова, 2003. – 130 с.

32. *Раманюк, М.* Беларускія народныя строі / М.Раманюк. – Мн.: Дзяніс Раманюк, 2003. –79 с.

33. *Савік, Л.С.* Пакліканыя: літаратура беларускага замежжа / Л.Савік. – Мн.: Тэхналогія, 2001. – 479 с.

34. *Самусік, А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэб. дапам. / А.Ф.Самусік. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

35. *Саракавік, І.А.* Беларусазнаўства / І.А.Саракавік. – Мн.: Веды, 1998. – 281 с.

36. *Сахута, Я.* Народнае мастацтва Беларусі / Я.Сахута. – Мн.: БелЭн, 1997. – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*37. Семянчук, А.* Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі: дапам. для студэнтаў / А.Семянчук. – Гродна: ГрДУ, 2000. – 160 с.

*38. Смятаннікаў, В.С.* Беларусазнаўства: вучэб.-метад. дапам. / В.С.Смятаннікаў. – Мн.: Бел. навука, 2000. – 148, [1] с.

*39. Ткачоў, М.* Замкі Беларусі / М.Ткачоў. – Мн.: Беларусь, 2007. – 200 с.

*40. Ткачоў, М.А.* Замкі і людзі / М.А.Ткачоў. – Мн.: Ураджай, 1991. – 331 с.

*41. Цітоў, В.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. / В.Цітоў. – 2-е выд. – Мн.: Беларусь, 2001. – 205 с.

*42. Цьвікевіч, А.* "Западно-руссизм": нарысы з гісторыі грамад. мыслі на Беларусі ў XIX і пач. XX в. / А.Цьвікевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 350 с.

*43. Чантурия, В.* История архитектуры Белоруссии: в 2 т. Т. 1. Дооктябрьский период / В.Чантурия. – Мн.: Вышэйш. шк., 1985. – 295 с.

*44. Чебоксаров, Н.Н.* Народы. Расы. Культуры / Н.Н.Чебоксаров, И.А.Чебоксарова. – М.: Наука, 1985. – 323 с.

*45. Чернявская, Ю.В.* Белорусы. От "тутэйшых" – к нации / Ю.В.Чернявская. – Мн.: ФУАинформ, 2010. – 512 с.

*46. Чернявская, Ю.В.* Белорус: штрихи к автопортрету: этнический самообраз белоруса в сказках / Ю.В.Чернявская. – Мн.: Четыре четверти, 2006. – 244 с.

*47. Шчакаціхін, М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М.Шчакаціхін. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 330 с.

*48. Этнаграфія* Беларусі : энцыклапедыя / Беларус. сав. энцыкл.; рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 375 с.

*49. Якуніна, Л.І.* Слуцкія паясы / Л.І.Якуніна. – Мн.: Акадэм. навук БССР, 1960. – 257с.

*50. Яскевіч, А.* Падзвіжнікі і іх святыні. Духоўная культура старажытнай Беларусі / А.Яскевіч. – Мн.: Полымя, 2001. – 364 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭТНАГЕНЕЗ І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная),*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэдактар І.В.Смяян
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,85.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.